ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

# ПЁТР ГЕОРГІЕВІЧ НІКІЦЕНКА
## (Да 80-годдзя з дня нараджэння)



2 студзеня 2023 г. спаўняецца 80 гадоў выдатнаму вучонаму-эканамісту, акадэміку, доктару эканамічных навук, прафесару, саветніку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута эканомікі Пятру Георгіевічу Нікіценку.

Нарадзіўся П. Г. Нікіценка ў в. Жыгалава Віцебскага раёна ў сям'і рабочага. Свой працоўны шлях пачаў электразваршчыкам на Віцебскім домабудаўнічым камбінаце, адначасова вучыўся ў сярэдняй школе рабочай моладзі. Практык дзяржаўнага будаўніцтва і кіравання, вучоны ў галіне эканомікі, палітычнай эканоміі, дзяржаўнага будаўніцтва і кіравання, ён заўсёды трывала авалодваў прафесіяй і ў гады службы ў Савецкай Арміі, і падчас навучання ў Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава, які скончыў у 1969 г. з адзнакай па спецыяльнасці «планаванне прамысловасці». Затым у 1976 г. пасля навучання ў аспірантуры паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Інтэнсіфікацыя вытворчасці і праблемы зніжэння фондаёмістасці ў прамысловасці (на прыкладзе машынабудавання і металаапрацоўкі БССР)»

На ўсіх дзяржаўных пасадах, якія займаў Пётр Георгіевіч, ён праявіў сябе кваліфікаваным спецыялістам, сумленным кіраўніком, які бярэ на сябе адказнасць за даручаную справу і давераны калектыў. Шмат энергіі, сіл і кіраўнічага таленту вучоны аддаў камсамольскай і партыйнай рабоце, дзейнасці ў выканаўчых органах улады г. Мінска. Аднак увесь гэты шлях прывёў да навуковай кар'еры; работы ў Белдзяржуніверсітэце. Падчас работы ва ўніверсітэце П. Г. Нікіценка сфарміраваўся не толькі як вучоны, але і як выкладчык. Ён распрацаваў шэраг новых спецкурсаў па пераходу эканомікі на рынавыя асновы і прагназаванню ў новых умовах гаспадарання, стаў арганізатарам навуковых даследаванняў па актуальных эканамічных пытаннях. Яшчэ ў 1970-я гг. ён прымаў удзел у распрацоўцы арганізацыйна-функцыянальных структур па рабоце з насельніцтвам, з'яўляючыся адным з аўтараў комплексных планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Цэнтральнага і Маскоўскага раёнаў г. Мінска. Паспяховая іх рэалізацыя была адзначана сярэбраным медалём ВДНГ СССР «За дасягнутыя поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі СССР». Манаграфія П. Г. Нікіценкі «Інтэнсіфікацыя вытворчасці і фондаёмістасць прадукцыі», апублікаваная ў 1981 г., была адзначана Ганаровай граматай Цэнтральнага кіраўніцтва Навукова-эканамічнага грамадства СССР.

Падчас работы ў БДУ Пётр Георгіевіч распрацаваў канцэпцыю ўдасканалення кіравання ўстойлівым сацыяльна-эканамічным развіццём г. Мінска. У выніку была надрукавана манаграфія «Эфектыўнасць назапашвання: сістэмны імператыў і метад прадпрымальніцтва».

П. Г. Нікіценка працягвае свае навуковыя пошукі. У 1991 г. ён заканчвае дактарантуру Аддзялення гуманітарных навук пры ЦК КПСС і паспяхова абараняе ў г. Маскве доктарскую дысертацыю на тэму «Сацыялістычнае назапашванне і фондаэканомны метад павышэння яго эфектыўнасці». Пётр Георгіевіч адным з першых даказвае, што грамадскае ўзнаўленне неабходна ажыццяўляць на макраўзроўні, з улікам сацыяльных і экалагічных фактараў. З 1995 па 1998 г. ён узначальвае з беларускага боку сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства «Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр». У 1991 г. П. Г. Нікіценку прысвоена вучонае званне прафесара, у 1994 г. ён абраны членам-карэспандэнтам, а ў 2000 г. – акадэмікам НАН Беларусі. Далейшая яго прафесійная дзейнасць звязана з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. З 1998 па 2010 г. Пётр Георгіевіч працуе на пасадзе дырэктара дзяржаўнай установы «Інстытут эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук

Беларусі». З 2002 па 2009 г. ён з’яўляецца акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і адначасова дырэктарам інстытута.

Сёння П. Г. Нікіценка – вядомы вучоны ў галіне палітычнай эканоміі, эканомікі дзяржаўнага будаўніцтва і кіравання. Упершыню ім абгрунтавана і ўведзена ў сусветны навуковы ўжытак паняцце «наасферная эканоміка» як эканоміка, заснаваная на выкарыстанні планетарнага розумуведаў; распрацаваны і ў 1990 г. атэставаны Акадэміяй грамадскіх навук пры ЦК КПСС наасферная сацыяльна-эканамічная тэорыя чалавечага развіцця і трохсектарная мадэль грамадскай вытворчасці, сфармуляваны эканамічныя падставы і прыярытэты інавацыйнага развіцця. Пётр Георгіевіч – аўтар тэарэтыка-метадалагічных і метадычных распрацовак па праблемах наасфернай эканомікі, эфектыўнасці інавацыйнага грамадскага ўзнаўлення, нацыянальнай бяспекі, устойлівага развіцця Беларусі ў кантэксце даследавання праблем чалавечай цывілізацыі.

Пэўным вынікам чарговага этапу ў біяграфіі вучонага стала фундаментальная праца «Наасферная эканоміка і сацыяльная палітыка: стратэгія інавацыйнага развіцця». У якасці эпіграфа выкарыстаны словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі: «Грамадства не можа існаваць без цэльнага збору ідэй, каштоўнасцей і норм, якія аб’ядноўваюць усіх грамадзян». Акадэмік П. Г. Нікіценка трактуе паняцце «наасферная эканоміка» больш шырока, чым раней, як разумны посткапіталістычны і постіндустрыяльны спосаб грамадскага ўзнаўлення тавараў, работ і паслуг на аснове ўдакладнення інавацыйных вытворчых зносін і пераважна постіндустрыяльных вытворчых сіл з адпаведнымі крытэрыямі эфектыўнасці: ступені адукаванасці чалавека, захоўваннем прыроды дзеля будучых пакаленняў, устойлівым ростам УВП і яго справядлівым размеркаваннем паміж членамі грамадства. У рабоце падкрэсліваецца, што ў трэцяй цывілізацыі дастойнае месца займуць тыя дзяржавы, якія фарміруюць у сваіх грамадзян яснае наасфернае мысленне, паколькі менавіта грамадства – не пакінутая прыродай дадзенасць, яно вынік дзейнасці людзей. Менавіта розум і дух чалавека фарміруюць грамадства.

Значнымі з’яўляюцца базавыя ўмовы станаўлення наасфернай эканомікі і сацыяльнай палітыкі. Аўтар манаграфіі падрабязна разглядае тэорыю і функцыі ўласнасці, у тым ліку на прыкладзе нашай краіны, робіць акцэнт на развіццё дасканалай канкурэнцыі шляхам павышэння якасці тавараў і паслуг, а таксама прадпрымальніцтва, бізнесу і фондавага рынку. У выніку разважанняў даюцца рэкамендацыі. У кнізе разглядаюцца падыходы і інструменты ўсталявання механізма інтэлектуальнай уласнасці. Засноўваючыся на навуковым прагнозе, аўтар канстатуе: карэнныя эканамічныя пераўтварэнні немагчымы без стварэння інстытуцыянальнай інфраструктуры, якая «прызначана забяспечыць устойлівасць новых эканамічных зносін, іх увязку ў сістэмным полі і, нарэшце, незваротнасць рэформ». Акадэмік П. Г. Нікіценка падкрэслівае, што інавацыйнае развіццё – не даніна модзе або чыёй-небудзь заўзятасці: «Яно абумоўлена шэрагам прычын і нацэлена на стварэнне посткапіталістычнай і постіндустрыяльнай (наасфернай) эканомікі».

Навуковы кіраўнік інавацыйных дзяржаўных праграм, прагнозаў бізнес-праектаў Пётр Георгіевіч працягвае фундаментальныя даследаванні па эканамічнай і сацыяльнай палітыцы, эканамічнай бяспецы з калектывам вучоных інстытута. Ён аўтар больш за 500 навуковых прац, метадычных дапаможнікаў, энцыклапедычных даведнікаў і слоўнікаў.

Пад кіраўніцтвам акадэміка П. Г. Нікіценкі былі выкананы Комплексныя прагнозы навукова-тэхнічнага прагрэсу на перыяд, у якіх вызначаны прыярытэты і стратэгія інавацыйнага развіцця. Распрацавана Нацыянальная праграма развіцця экспарту Рэспублікі Беларусь, якая стала навуковай асновай фарміравання экспартнай палітыкі, эканамічных зносін Рэспублікі Беларусь. Пад яго кіраўніцтвам Інстытут эканомікі НАН Беларусі распрацоўваў новыя дзяржаўныя праграмы, сярод якіх «Эканоміка і грамадства» і «Нацыянальная бяспека».

Значным з’яўляецца ўклад вучонага ў падрыхтоўку навуковых кадраў. Дзякуючы яму, больш за 200 айчынных і замежных дактароў і кандыдатаў навук працуюць сёння самастойна. На працягу многіх гадоў ён быў старшынёй экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па эканамічных навуках, а сёння ён – член Савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый пры Інстытуце эканомікі НАН Беларусі.

Пётр Георгіевіч Нікіценка з’яўляецца членам рэдкалегій шматлікіх айчынных і міжнародных часопісаў.

Акадэмік П. Г. Нікіценка ўнёс значны ўклад у арганізацыю навукі ў Рэспубліцы Беларусь. З яго прыходам на пасаду дырэктара Інстытута эканомікі НАН Беларусі новы імпульс атрымаў працэс фарміравання інстытута як комплекснай эканамічнай навуковай установы, якая спалучае фундаментальныя даследаванні з распрацоўкай мэтавых прыкладных праграм развіцця нацыянальнай эканомікі Беларусі. Для вырашэння гэтых задач у інстытуце былі адкрыты новыя, аптымізаваны існуючыя і аднаўлены былыя кірункі навуковай дзейнасці, сярод якіх даследаванні сусветнай эканомікі і міжнародных зносін з сусветнай супольнасцю; распрацоўка пытанняў развіцця і адраджэння вёскі; інавацыйнага развіцця; вывучэнне рэсурснага патэнцыялу і эканамічнай бяспекі і шэраг іншых актуальных напрамкаў. Створаныя ў інстытуце арганізацыйныя структуры дазваляюць забяспечыць выкананне комплексу актуальных сацыяльна-эканамічных даследаванняў.

Пётр Георгіевіч неаднаразова адзначаўся высокімі ўрадавымі ўзнагародамі за дасягненні ў галіне навукі і дзяржаўнай дзейнасці. Ён узнагароджаны медалямі СССР, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, сярэбраным медалём ВДНГ СССР, Ганаровай граматай Навукова-эканамічнага таварыства СССР «За лепшую апублікаваную работу ў галіне арганізацыі і кіравання эканомікай», медалём Францыска Скарыны, залатым медалём Саймана Кузнеца, Ганаровымі граматамі Мінгарвыканкама, ВАКа, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца лаўрэатам прэмій Прэзідэнтаў трох акадэмій (Беларусі, Украіны, Малдовы) за выдатныя навуковыя дасягненні (2002 г.), Міжакадэмічнага міжнароднага рэйтынга папулярнасці «Залатая фартуна» (2004 г.), узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», граматамі міністэрстваў і ведамстваў.

Неаднаразова быў абраны дэпутатам мясцовых Саветаў.

Узрастаючы інтарэс, які акадэмік П. Г. Нікіценка праяўляе да рэалій нашага часу, пакідае надзею на тое, што і далей вучоны будзе ў фарватары навукі і грамадскага жыцця. З юбілеем!

*Бюро Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*вучоныя Інстытута эканомікі*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*